Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 15 (608). Wilnia, Niadziela 7 Krasawika 1935 h. Hod XI (XIX).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčynlena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Як-жа нам назвацца?

(*Да справы абнаўленьня БХД*).

Ужо даволі многа пісалася ў «Бел. Крыніцы» аб справе абнаўленьня БХД. Ужо былі абгаворaны бадай усе важнейшыя праграмныя пункты. Няма-ла так-жа было ўжо пададзена і назоваў абноўленай нашай арганізацыі. Сярод іх спатыкаюцца, здаецца, цалком добрыя. Вось-жа я ў гэтым артыкуле пазволю сабе крыху бліжэй затрымацца над праектаванымі назовамі і, паводле сваей думкі, некаторыя з іх запрапанаваць, як магчымыя да прыняцьця.

Дагэтуль было праектаў-назоваў, калі ня мыляюся, дванаццаць. Вось яны: 1) Беларуская Дэмократычная Партыя, 2) Беларускае Народна-Радыкальнае Аб'еднаньне, 3) Зьвяз Адраджэньня Беларускага Народу, 4) Лучнасьць Вызваленьня Беларускага Народу, 5) Беларуская Працоўная Грамада, 6) Беларускае Народнае Аб'еднаньне Працоўных, 7) Беларуская Лучнасьць, 8) Назоў пакінуць дагэтулешні — БХД, 9) Беларускае Народна-Соцыяльнае Аб'еднаньне, 10) Партыя Народнай Незалежнасьці Беларусі, 11) Беларуская Народная Солідарнасьць і 12) Беларускае Народнае Аб'еднаньне.

Цяпер затрымаемся над кожным праектам-назовам паасобку, каб бліжэй да яго прыгледзіцца і належна апаніць.

1. Назоў Беларуская Дэмократычная партыя агулам быўбы нішто і яго, калі-б ня было лепшага, можна было-б прыняць. Такім чынам назоў гэты можна мець на ўвазе.

2. Беларускае Народна-Радыкальнае Аб'еднаньне мне не да ўспадобы, бо ў ім знаходзіцца слова «радыкальны», якое, праўду кажучы, ня мае ў сабе бадай ніякага зьместу.

3. Зьвяз Адраджэньня Беларускага народу — так-жа быўбы нішто, каб толькі замест слова «зьвяз» ды знашлося слова лепшае.

4. У назове — Лучнасьць Вызваленьня Беларускага Народу — не падабаецца мне «лучнасьць», а так-жа не падабаецца завялікі напіск на палітычную працу арганізацыі (вызваленьне!) коштам культуры народу. Гэтак прынамсі вынікае з назову.

5. Беларуская Працоўная Грамада — гэта было-б адаграваньне старога і мела-б запах камсамолу: працоўная! Кожнаму ясна, што не буржуяў-жа мы арганізуем і не гультаёў якіх. Знача, назоў гэты не падходзіць.

6. Беларускае Народнае Аб'еднаньне Працоўных — не падходзіць дзеля вышэй сказанага.

7. Беларуская Лучнасьць — нічога ідэовага не гавора і прынятай быць ня можа. Беларускай Лучнасьцяй можна назваць і клюб скокаў ці ігры ў карты.

8. БХД — пакінуць няможна; калі абнаўляць арганізацыю, дык трэба абнавіць і назову. Праўда, староньнікі старога назову шмат маюць падстаў так думаць, але, здаецца мне, яшчэ іх больш маюць староньнікі поўнай абновы.

9. Беларускае Народна-Соцыяльнае Аб'еднаньне — можна было-б прыняць. Паважных закідаў гэткаму назову, здаецца, паставіць ня можна, хіба толькі тое, што назоў гэты крыху пахне Гітлерам і што ў беларусаў ёсьць кірунак народных соцыялістых, які путаўся-б з Народна-Соцыяльным Аб'еднаньнем. Аднак не забывайма, што народна-соцыяльны кірунак — гэта адно, а сусім другое народна-соцыялістычны.

10. Партыя Народнай Незалежнасьці Беларусі — назоў нязручна збудаваны і да таго дужа аднабокі.

11. Назоў Беларуская Народная Солідарнасьць — мог-бы быць, толькі цалком тут непатрэбнае чужое слова — солідарнасьць.

12. Беларускае Народнае Аб'еднаньне — можа быць назовам абноўленай нашай арганізацыі. Назоў гэты не перашкаджаўбы аб'яднаць усе беларускія сілы, стаячыя на грунце беларускай нацыі.

Такім чынам я прапаную да выбару наступныя назовы абноўленай БХД: 1) Беларуская Дэмократычная Партыя, 2) Зьвяз Адраджэньня Беларускага Народу, 3) Беларускае Народна-Соцыяльнае Аб'еднаньне, 4) Беларускае Народнае Аб'еднаньне і ўрэшце дадаю ад сябе назоў: Беларускае Дэмократычнае Аб'еднаньне.

Канчаючы, хачу яшчэ адцеміць, што як назоў, так і ўся праграма абноўленай БХД павінна імкнуцца да таго, каб аб'яднаць усе жывыя, сапраўды творчыя беларускія сілы на грунце яснай, здэцыдаванай і сучаснай ідэолёгіі нацыянальнай і соцыяльнай.

М. К—к.

БЕЛАРУСЫ! Падтрымлівайце сваю прэсу. Выпісвайце найстарэйшую беларускую газэту „Беларускую Крыніцу!"

17-я ўгодкі Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі

Дзень 25 сакавіка — гэта дзень вялікага факту ў гісторыі Беларускага народу. — 25 сакавіка 1918 г. Беларускі народ, вуснамі сваіх прадстаўнікоў — Радай Беларускай Народнай Рэспублікі, — у Менску абвесьціў Беларусь вольнай і незалежнай дзяржавай.

Гэты дзень — 25 сакавіка — беларускае грамадзянства з году ў год сьвяткуе ўрачыста. У гэты дзень усе беларускія народныя арганізацыі, а праз іх і сьведамую частку народу заўсёды злучае адна супольная ідэя Беларускага народу — ідэя незалежнасьці выяўленая Актам 25 сакавіка 1918 г.

Беларускае незалежнае грамадзянства Зах. Беларусі, аб'еднанае пад бел-чырвона-белым сьцягам у Беларускі Нацыянальны Камітэт, у Вільні сёлета 17-тыя ўгодкі Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі сьвяткавала гэтак:

I. Набажэнствы.

24 сакавіка, у нядзелю, а гадзіне 10 раніцы ў касьцеле сьв. Мікалая кс. д-р. Ст. Глякоўскі адправіў урачыстую Імшу, падчас якой пяяў беларускі касьцельны хор. На гэтае набажэнства зыйшлася ня штодзенная колькасьць народу. Між іншымі, былі і прадстаўнікі літоўскага грамадзянства. Пасьля набажэнства кс. В. Гадлеўскі сказаў, глыбокае зьместам, казаньне.

II. Урачысты сход Бел. Нац. К-ту.

На ўрачысты сход Беларускага Нацыянальнага К—ту, які адбыўся ў залі Б.І.Г.ІК., зышліся ўсе сябры К-ту і госьці. Заля была напоўнена народам. Былі на гэтым урачыстым сходзе, між іншымі гасьцямі, старшыня Тымч. Літоўскага К-ту грам. Сташыс, а так-жа прадстаўнікі ўкраінцаў — моладзі і старэйшых.

За прэзыдыяльным сталом — старшыня Бел. Нац. К-ту ў асысьце двух сяброў прэзыдыюму Нац. Камітэту.

Старшыня К-ту Я. Пазьняк, адкрываючы ўрачысты сход, прывітаў гасьцей і ў кароткай прамове адзначыў важнасьць Акту 25 сакавіка 1918 году. Падчас сваей прамовы, старшыня Пазьняк запрапанаваў устаньнем з мейсц ушанаваць памяць усіх барацьбітоў, што аддалі сваё жыцьцё на аўтар Бацькаўшчыны ў барацьбе за волю Беларускага народу. Гэтак ушанаваўшы памяць памёршых, старшыня ў далейшых словах коратка выказаў жыцьцёвасьць ідэалу Акту 25 сакавіка 1918 году ў беларускім грамадзянстве, што зьяўляецца найлепшай зарукай зьдзейсьненьня гэтага ідэалу.

Рэфэрат.

Пасьля прамовы старшыні, мгр. Я. Шутовіч прачытаў рэфэрат на тэму „Народ і дзяржава." Мгр. Шутовіч, у сваім рэфэраце, выказаў прыметы, неабходныя дзеля існаваньня народу а так-жа значэньне для народу дзяржавы.

Прэлегент адзначыў, што Беларускі народ, мае ўсе прыметы дзеля існаваньня, а так-жа дасьпеў, каб мець сваю собскую дзяржаву. А собская дзяржава шмат дабра дае народу, — пацьвярджаюць гэта вельмі паўстаўшыя па вайне дзяржавы, у асобнасьці Літва, калі параўнаць яе заняпаласьць з часоў расейскай няволі, з сучасным станам, калі мае дзяржаўную незалежнасьць.

Прывітаньні.

Па рэфэраце — пачаліся прывітаньні. Першы выступіў з прывітальнай прамовай старшыня Тымч. Літоўскага К-ту грам. К. Сташыс. У сваей прамове, палітоўску, прадстаўнік Літоўцаў выказаў, што імкненьне ў беларускім народзе да волі зрадзіла Акт 25 сакавіка 1918 г. і гэтае шуканьне волі зьдзейсьніць ідэал гэтага акту. Прамоўца закончыў пабеларуску пажаданьнем, каб ідэал Акту 25 сакавіка 1918 году найхутчэй зьдзейсьніўся. Наступным прамаўляў паукраінску прадстаўнік ад Украінцаў студ. Павліш, які выказаў імкненьне украінцаў да собскай дзяржаўнасьці і гаворачы аб ім і імкненьні Беларусаў да палітычнай дзяржаўнай незалежнасьці заклікаў беларускую моладзь да працы і супрацоўніцтва на шляху да лепшай долі абодвых народаў — Беларускага і Украінскага.

Пасьля вусных прывітаньняў, пачаліся прывітаньні пісьменныя. Сябра прэзыдыюму—сакратар Бел. Нац. К—ту Ул. Казлоўскі — прачытаў прывітаньні пісьменныя: 1) Вяч. Багдановіча— віцэ-старшыні Нац. К-ту, 2) Старшыні Рады Бел. Нар. Рэспублікі В. Захаркі: — ...Ад душы вітаю надзвычайна цяжкую працу Нац. К-ту... Нядолю бацькаўшчыны мусім перамагчы... 3) Беларускай Рады ў Празе: — ...Рада сэрдэчна вітае Нац. К-т... Рада заўсёды з тымі, што вераць у свой народ і бароняць Бацькаўшчыну... 4) Бел. Асьвет. Т-ва „Беларуская Хата" (Рыга—Латвія), 5) Беларускіх Студэнтаў у Рызе: — ...Ня згасьне нам сонца ўзышоўшае 25 сакавіка 1918 г... 6) Т-ва Беларускай Моладзі ў Латвіі, 7) Беларусаў Студэнтаў і старэйшых у Бэрліне: ...Шчырае прывітаньне з днём вялікага сьвята Беларускага Народу... 8) Міхася Машары: — ...У дзень вялікага сьвята— у дзень 25 сакавіка... у дзень вялікага сымбалю народнай волі—я ўсей душой лучуся з Вамі...і...пасылаю гарачае прывітаньне... 9) а. Ул. Талочкі — Бог у помач Дарагому майму Народу Беларускаму. Хай зьдзейсьняцца ўсе яго імкненьні — народныя і дзяржаўныя! 10) кс. В. Шутовіча, 11) д-ра Т. Куніцкага і ягонай жонкі Аўгені Куніцкай, 12) д-р Ф. Сабалеўскай і Юрага Сабалеўскага, 13) Я. Шэйбака, Яна Нагорнага і Юльяна Нагорнага, 14) Сялян з Жодзішак, 15) М. Маскаліка з Мюнхену і другіх.

III. Канцэрт.

На заканчэньне ўрачыстасьці, беларускі хор, пад кіраўніцтвам інж. А. Клімовіча, прапяяў вязанку мэлёдыйных мілагучных беларускіх песьняў. Асаблівую ўвагу звярочвалі на сябе беларускія народныя песьні, прыкл. песьня „Салавейка лугавы" гарм. Бразіса, „Загарэўся сыры бор" гарм. А. Стэповіча і інш. У канцы хор запяяў „Не пагаснуць зоркі ў небе..." — беларускі народны гімн, падчас пяяньня каторага

ўсе прысутныя стаялі. На гэтым урачыстасьць пачаўшыся а гадзіне 8, кончылася а гадзіне 10 увечары.

Сьвяткаваньне Абвешч. Незал. Беларусі ў полёнафілаў.

Беларускія полёнафілы 17-тыя ўгодкі Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі сьвяткавалі, як заўсёды, аддзельна. У панядзелак — 25 сакавіка,—у Пятніцкай царкве а. Кульчыцкі адправіў, пры асысьце новага сьвяшч. Міхалевіча і другіх, урачысты малебен, на пачатку сказаўшы прыурочану да сьвята пропаведзь.

На набажэнстве была ўся бел. гімназія — вучні і вучыцялі, а такжа і іншыя. У беларускай філіі гімназіі Ю. Славацкага ўвечары 25 сакавіка адбылася акадэмія: быў рэфэрат аб Акце 25 сакавіка 1918 г. і канцэрт беларускай песьні з дэклямацыямі. На гэтай урачыстасьці былі: вучні беларускай гімназіі з усімі вучыцялямі, некалькі праваслаўных духоўнікаў на чале з арх. Хвядосам і прадстаўнікі польскага грамадзянства.

Атмасфэра настрою — супроць комуністычнае становішча на марксаўскай плятформе да беларуска-польскага зьбліжэньня.

U Litoŭcaŭ.

(*100-lećcie naradzinaŭ biskupa Ant. Baranoŭskaha*).

Sioleta ŭ studni miesiacy minuła 100 hadoŭ ad naradžeńnia zasłužanaha prad swaim narodam litoŭca— biskupa Antanasa Baranoŭskaha, paeta i wučonaha.

Z hetaj nahody 24.II Litoŭski Uniwersytet u Koŭni ładziŭ u češć jaho ŭračystuju akademiju, a Litoŭskaje Nawukowaje T-wa ŭ Wilni takuju-ž akademiju ładziła 16 III.

Nieadrečy budzie z wydatnym i zasłužanym henym litoŭcam paznajomicca j nam.

Radziŭsia A. Baranoŭski ŭ 1835 h. u Anykštach. Baćki jaho — sialanie, značna ŭžo spolščanyja. Małady Antonas wučyŭsia śpiarša ŭ parafijalnaj škole papolsku, a paśla ŭ škole narodnaj parasiejsku. Dalej wučyŭsia ŭ duchoŭnaj seminaryi ŭ Worniach, u duchoŭnaj akademii ŭ Pieciarburzie i ŭrešcie ŭ Miunchen, u Insbruku, Rymie. Pamior 1903 h., jak Sejnanski biskup.

Nia hledziačy na toje, što byŭ jon spolščany, pisaŭ adnak palitoŭsku. A stałasia heta woś jak. Baranoŭski, budučy jašče ŭ seminaryi, padružyŭ z klerykam Kajrysam, jaki pisaŭ palitoŭsku i da hetaha jaho nakłaniaŭ. Nastroi ŭ seminaryi siarod klerykaŭ ahułam byli da litoŭskaj mowy warožyja. Časta tam možna było spatkacca z zakidam, što palitoŭsku ničoha pryhožaha j napisać niamožna. Woś-ža heta haloŭnym čynam i spryčyniłasia da taho, što Baranoŭski pačaŭ pisać palitoŭsku. U 1858 h. napisaŭ jon pieršy twor wieršam „Anykščiu šilelis“ (Bor u Anykštach), u jakim pakazaŭ, jak swoj talent, tak i pryhožašć litoŭskaj mowy.

Apračа paezii, pracawaŭ A. Baranoŭski tak-ža j na niwie nawukowaj, jak pierakładčyk św. Pisańnia, na litoŭskuju mowu, wučony znaŭca litoŭskaj mowy i jak matematyk.

Literaturnaj i nawukowaj swajej pracaj biskup A. Baranoŭski pałažyŭ wialikija zasłuhi dla sprawy adradžeńnia litoŭskaha narodu. *P. Ł.*

А. Пінчук.

Сучаснае палажэньне беларускай вёскі.

IV. Сямейныя нязгоды.

Бядноцтва і цемра — найгоршыя спадарожнікі ў жыцьці чалавека. З іхняй прычыны людзі пачынаюць траціць свае моральныя вартасьці і дзічэюць, у выніку чаго амаль у кожнай вясковай хаце сямейныя нялады.

Сваркі й бойкі паміж бліжэйшымі сваякамі — штодзеннае зьявішча. Прычынаю гэтага — паступовае звужваньне матэр'яльнай базы, на каторай утрымліваецца сялянская сям'я.

Зямлі мала, даходаў яшчэ меней, а расходы вялікія. Кожны сябра сялянскай сям'і, атрымліваючы на сваю долю вельмі малую частку даходу з гаспадаркі, — лічыць сябе пакрыўджаным, не разумеючы той агульнай прычыны, каторая прыводзіць да галіты.

Пры гэтакіх абставінах адносіны паміж бацькамі і дзяцьмі прынялі, сапраўды, пагражаючы характар і, калі жыцьцё ня зьменіцца на лепшае, то сучаснаму сямейнаму ладу сярод нашага сялянства пагражае паважная небясьпека.

Бацькі ў большасьці выпадкаў выкарыстоўваюць, як поўнаўласныя гаспадары, свае праўныя прывілеі і распараджаюцца гаспадаркаю, ня лічачыся з інтарэсамі сваіх дарослых дзяцей. Згодна з існуючымі ў Польшчы законамі, бацька можа прадаць усю гаспадарку і нават зямлю, а грошы забраць на свае асабістыя патрэбы, і ніхто з сям'і ня мае права яму гэтага забараніць.

Суды, калі да іх зьвяртаюцца пакрыўджаныя, адказваюць, што ў Польшчы абавязваюць законы, па каторым уласьнік мае права рабіць са сваёю ўласнасьцю, што захоча.

Што марнатраўства бацькоў не пашырылася на вёсцы агульна, то толькі таму, што ёсьць яшчэ людзі, каторыя крыху трымаюцца дзядоўскіх традыцыяў і пачуваюцца да моральнай адказнасьці.

Але з кожным годам павялічваецца лік такіх, каторыя не прызнаюць ніякіх аўторытэтаў і абавязкаў і хутка толькі яны будуць надаваць агульны кірунак вясковаму жыцьцю.

З другога боку, — дзеці, працуючы на бацькаўскай гаспадарцы, ня маюць прад сабой будучыні і бачаць, што ім няма куды падзецца.

У гэткім жыцьці дзеці бацькоў ня толькі не шануюць, але крыўдзяць і жадаюць хутчэйшай іхняй сьмерці.

Сапраўды, як гэта ні жудасна, а справы на вёсцы ўлажыліся ў такі спосаб, што толькі сьмерць бацькоў разьвязвае дзецям рукі і яны пачынаюць тады самастойнае гаспадараваньне, пазбыўшыся апекі і няпэўнасьці за сваю будучыню.

Гэтакім чынам, дзякуючы ненармальнаму гаспадарчаму ладу і з прычыны адсутнасьці рацыянальнага ўпарадкаваньня жыцьця з боку праўнага — сямейнае сужыцьцё сялян жудаснае, што вядзе да поўнай дэморалізацыі народу.

Калісь было добрым прыкладам, каб пахваліць сужыцьцё сваякоў, зтуль і прыказка — жыве як брат з сястрою; — цяпер гэтакі сказ быў-бы толькі іроніяй... Няма большай нязгоды, спрэчак і бояк, як паміж братамі і сёстрамі, і няма ў судох больш спраў, як тых, каторыя паўсталі паміж сваякамі. Усе гэтыя факты, якія штодзень запісваюцца паліцыяй, судамі, валаснымі ўправамі і іншымі польскімі ўстановамі, наганяюць жах за будучыню Беларускага народу, калі яму прыдзецца жыць у гэткіх варунках даўжэйшы час.

Дэморалізацыя, як вынік паглыбляючагася бядоцтва і анархіі ў лоне сям'і, можа прыняць такія разьмеры, якім трудна будзе даць раду. Асабліва трэба дбаць аб лёс нашай моладзі, каторая падрастае ў ненармальных абставінах. Але аб гэтым будзе гутарка ў наступных артыкулах. Жыцьцём вёскі цікавяцца толькі валасныя чыноўнікі і сэквэстратары. Як жыве селянін, што творыцца ў ягонай сям'і, што ён думае і куды йдзе, — гэта нікога не інтэрэсуе.

Некаму, нават, залежыць на тым, каб на вёсцы ніколі ня было парадку і каб сялянства было занята сваркамі і бойкамі, бо яны перашкаджаюць думаць аб іншых і паважнейшых справах...

З усяго, што дзеецца на вёсцы, мы бачым, што народ зайшоў ня толькі ў гаспадарчы вузкі завулак, але ён пачынае траціць і свае духовыя, агульна-людзкія вартасьці.

Гэтае зьявішча тлумачыцца тым, што вёска пакінена на апеку лёсу і што там не прароблена элемэнтарная праграма, як у кірунку гаспадарчай направы жыцьця, так і ў жыцьці грамадзкім.

Беларуская інтэлігенцыя, жывучы сярод свайго народу, дакладна ўяўляе сабе сучаснае палажэньне вёскі, але пакуль-што сядзіць бязрадна.

Яна адапхнёна ад уплываў на грамадзкае і палітычнае жыцьцё, яна ня мае сілы, каб накіраваць сялянскае жыцьцё на адпаведны шлях. Але, які-бы сумны выгляд ня мела беларуская вёска, з кожным годам павялічваецца там армія нацыянальна сьведамых беларусаў, грамадзян у поўным значэньні гэтага слова, каторыя добра ведаюць— чаго хочуць.

Падзяка.

Урад Беларускага Студэнскага Саюзу пры У.С.Б. у Вільні гэтым складае шчырую падзяку Гр. Гр. Бэкешысе, Кульчыцкай і Ярэмічысе за ласкавае прыняцьце на сябе абавязкаў Гаспадынь ад БСС., адначасна за дзейны ўдзел у зладжаньні дня 2.III.1935 г. VI Традыцыйнага Балю трох Студэнскіх Саюзаў (Бел., Літ. і Укр.).

Вільня, 22.III 1935 г.

(—) А. Дасюкевіч, сакратар
(—) М. Шчорс, старшыня

Wincuk Adwažny. 33)

Chłapiec.

POWIEŚĆ.

VIII. Hdzie kryŭda, hdzie praŭda?

— Dosyć hetaha,—skazaŭ inspektar:—ksiondz da pedahahičnaj rady bolš nie naležyš: ja siahodnia zwalniaju ksiandza sa škoły i na lekcyi bolš nia puščul Do świdańja!

— Jakoje wy majecie na heta prawa? Mianie naznačyŭ biskup.

— Biskup? heta ciapier nia wielmi ważnaja asoba, bo...—tut inspektar ścišyŭ hołas i zašypieŭ, jak hadzina ŭ kuście,—...wašaha biskupa ŭčora wiečaram žandary wywieźli až pad Uralskija hory. Nu, što? Maju ja prawa, ha?... Do świdańja!

Tut inspektar tryumfalna hlanuŭ zhary na źbiantežanaha ksiandza, a na wusnach jahonych, pad ryžymi wusami, błudziła ŭśmieška jedkaj ironii.

Ksiondz Hałuza ubačyŭ, što ŭsio skončana: uziaŭ kapialuš, ahulna ŭsim pakłaniŭsia i paśpiešna pajšoŭ da dziekana. Wiestka ab biskupie tak była niespadziawanaj, što jon zabyŭsia i ab swajej kryŭdzie i ab školnych sprawach, a tolki ŭ dumkach imknuŭsia „až pad Uralskija hory“ za tym-ža biskupam, katory tak jašče niadaŭna ŭzłažyŭ na jaho ruki z bahasławienstwam i sa sławami: „Pryjmi Ducha Światoha!“

Hetaja wiestka i dziekanu była sumnaj nawinoju.

— Ja hetaha jašče nia wiedaŭ,—kazaŭ jon,— ale z dnia na dzień spadziawaŭsia.

Jakto? Dziela čaho, ksiondz dziekan, spadziawaŭsia?

— Widziš, ksiondz,—tut užo pajšło na ŭsio — albo tak, abo hetak: rasiejski ŭrad uwodzić ahulnaje abrusieńnie i naciskaje z całaj siły, ale prytym choča ŭsio rabić tajna i podstupam, a nawiet pamahčymaści miakka. A naš biskup reža „prosta z mostu“ i nia ŭstupaje ni na adzin šah. Wot u niadzielu wiečaram pryjšła da mianie ad biskupa papiera. Nia wiedaju, čamu jana ŭ Murawanku spaźniłasia, bo ŭ druhich dekanatach jaje dastali pierad niadzielaj i ŭžo pračytali z ambonii pa ŭsich parachwijach. U hetaj papiery biskup zabaraniaje puščać dziaciej u cerkwu i piajać u carkwie, a nawiet nie pazwalaje chadzić u carkoŭnyja škoły, bo tam wučać prawasłaŭnych pacieraŭ i katachizmaŭ. Biskup na ŭsio heta wostra swarycca i zabaraniaje pad ciažkimi kaścielnymi karami. Ja ŭžo adrazu zrazumieŭ, što heta lohka nia skončycca. Až bačym, što i praŭda. Dy što tut hawaryć! takaja rabota zaŭsiody končycca „Uralskimi harami.“ Rasiejski ŭrad wielmi chitry i jon sam ab hetym wiedaje; ale prytym strašenna durny i sam jašče ab hetym nia wiedaje, — dyk z takim uradam možna žyć: treba tolki mieć rozum z pieradu. Świežaja historyja nas wučyć — heta ŭžo nia pieršy biskup tudy pajechaŭ.

— A ja jakraz siahodnia paspračaŭsia z inspektaram za cerkwu, — kazaŭ ksiondz Hałuza:— i jon adstawiŭ mianie sa škoły saŭsim. Ci jon maje na heta prawa?

— Ciapier takija ŭ nas paradki, što ŭrad nia kirujecca prawam, ale patajnymi cyrkularami. Kali tolki hetym skončycca, dyk wielmi dobra; bo ja spadziajusia, što pajedzieš, ksiondz, u klaštar na pakutu. Užo sabrałasia na ciabie mnoha matarjału. A toj ryžy inspektar, jak zajesca, dyk nia spuścić: jon užo źjeŭ u mianie adnaho wikaraha. Treba być bolš aściarožnym; a wy, maładyja, usioroŭna jak dzieci, ci jak toj małady koń: nie hladzić — kamień, hara, ci bałota — rwie z usiej siły, i abo pastronki tresnuć, abo sam treśnie. Nu, a pośle treba pakutawać...

— Za sprawiadliwaść nia strašna i pakuta!— skazaŭ Hałuza. Ksiondz Hałuza wiedaŭ, što ŭ takich abstawinach zdarowaja narodnaja praca nie mahčyma. Ale majučy dušu česnuju i prostuju, nia ŭmieŭ ni chitryć, ni palitykawać: išoŭ swajej prostaj darohaj i hawaryŭ ab usim jasna i adkryta, i damahaŭsia swaich prawoŭ. Zatoje mieŭ mnoha ščyrych pryjacielaŭ, ale jašče bolš worahaŭ.

— Ja nie mahu, — kazaŭ jon dziekanu, — taić swajej narodnaści i swaich pierakanańniaŭ; nie mahu ani patakiwać, ani nadskakiwać druhim, asabliwa silnym hetaha świetu. Takaja chitraść pańižaje čaławieka, a praŭda daražej za žyćcio, bo praŭda prybližaje da Boha, bo sam Boh jość Praŭdaj.

Niachaj mianie bačać usie takim, jakim ja jość: ani chawacca, ani stydacca nia budu. Niachaj sabie z takoha śmiajucca, złujucca, ci karajuć — heta mnie ŭsioroŭna. Ja stydajusia tolki swaich hrachoŭ, ale praŭdy stydacca nia budu. I ja wiedaju, što tolki takija idejnyja, prostaliniejnyja i česnyja ludzi daskanalna wypaŭnili swaje abawiazki pierad Boham i dla adradžeńnia swajho narodu. A ŭsie krywadušniki i padlizy nadaremna zmarnawali swaje siły i naležnuju sławu.

— Z takimi pierakanańniami, ksiondz, skora narwieśśia!

— Ja heta wiedaju. Choć ja i małady, ale ŭžo i tak mnoha razoŭ narywaŭsia; adnak dahetul nie adstupiŭ ad praŭdy ni na kaliŭca, i na pryšłašć taksama budzie. Pomniu ŭ seminaryi takuju razmowu z swaim rektaram. Jon kaža: — Ty, Tamaš, biełarus? — Biełarus! — kažu ja. —Wot wydumaŭ nawinul — kaža rektar — Na što tabie heta? Kaścioł palityki nia lubić: kaścioł zajmajecca tolki zbaŭleńniem duš. — A ja jamu kažu: — Heta bolšaja palityka, kali kaho Boh stwaryŭ biełarusam, a jon sam siabie nazywaje palakom.

— Nu, nu,—kaža rektar — ty maješ wostry jazyk, ale budź aściarožny! Ty wieš sam, že i ja białorusin, ale cóž z tego? — A ja jamu kažu: — Bywaje i tak, što palityka zahłušaje nawiet zakon natury i hołas krywi.—Nu, idź sobie, idź!—adprawiŭ mianie rektar, ale sam pačyrwanieŭ až da wušej.

— Widziš, ksiondz, — hawaryŭ dziekan: — praŭda nie pawinna wyklučać rastaropnaści: pierš treba siem razoŭ pieradumać, a tahdy hawaryć!

— Ale rastaropnaść nie pawinna wyklučać adwahi, i prytym raztaropnaściaj nia možna nazywać zwyčajnaj truśliwaści, nizkaści i maładušnaści. A ŭłaśnie ciapierašniaja palityka časta dachodzić da taho, što ludzi nawiet chitraść, abo i podłaść nazywajuć rastaropnaściaj. Takaja fałšywaja rastaropnaść usioroŭna pośle pamścicca na čaławieku i na sprawie, katoruju jon wiedzie, a što najhoršaje — heta zabiwaje ŭ nas ludzkuju hodnaść: my stanowimsia abrydliwymi sami sabie. Poŭnaja roŭnawaha pamiž pierakanańniem i wonkawaj dziejnaściaj čaławieka — wot ideał, da katoraha my pawinny wytrywała imknucca.

— Cikawy z wašeci čaławiek, —skazaŭ dziekan Kiškielis i wielmi hłyboka zadumaŭsia.

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Незацьверджаньне канфіскаты часапісу „Калосьсе“. Віленскі Акружны Суд на паседжаньні дн. 14.III. сёлета не зацьвердзіў дакананай Віл. Гарадзкім Старастам канфіскаты першае кніжкі беларускага літаратурна-навуковага часапісу „Калосьсе“. У сувязі з гэтым забраныя экзэмпляры „Калосься“ Стараста вярнуў рэдакцыі гэтага часапісу.

Суд не знайшоў нічога праступнага ў сканфіскаванай кніжцы „Калосься“.

Суды. — 15-га сакавіка сёлета Віл. Гарадзкі Суд разглядаў справу рэдактара „Шляху Моладзі“ грам. Язэпа Найдзюка, у сувязі з канфіскатай № 9 (69) „Шл. Моладзі“. Суд па высьненьнях падсуднага разгляд справы адлажыў.

—28-га сакавіка Акружны Суд у Вільні,—як інстанцыя апэляцыйная,—разглядаў справы рэдактара нашага часапісу грам. Я. Пазьняка і справу рэд. „Новага Шляху“, грам. У. Казлоўскага. Абодвых рэдактароў Суд першай інстанцыі — гарадзкі—засудзіў на кары: гр. Я. Пазьняка—на 2 тыдні арышту з варунковым спыненьнем і 100 зл. штрафу за тое, што зьмясьціў у „Б. К.“ у мін. годзе артыкул п. н. „Ніякі саюзьнік“, а грам. У. Казлоўскага на такую-ж кару — за зьмяшчэньне, сканфіскаваных пасьля, артыкулаў у „Новым Шляху“. Апэляцыйны Суд кару рэд. Пазьняку, дадзеную Гарадзкім Судом, — зацьвердзіў, а разгляд справы рэд. Казлоўскага — адлажыў.

Агульны гадавы сход Рады Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры адбыўся дня 31.III у ўласным памешчаньні Інстытуту — Вільня, Завальная 1. Сход выслухаў справаздачы ўступаючых уладаў Інстытуту, пацьвердзіў іх, выразіў старому ўраду падзяку, і выбраў новыя улады. Падробная справаздача аб сходзе будзе зьмешчана ў „Б. К.“ пазьней.

Зборкі працаўнікоў над чысьцінёй беларускай мовы. Апошняя зборка адбылася 28 мін. м-ца. Наступная будзе 2 траўня а гадз. 7 увечары ў залі БІГіК — Завальная 1—1 у Вільні

З выдавецкае нівы. Вышлі з друку: „Самапомач“ № 2-3 (за м-цы люты-сакавік) — беларускі гаспадарска-коопэратыўны часапіс; „Chryścijanskaja Dumka“ № 3 (за сакавік)—месячны беларускі часапіс для беларусаў каталікоў; „Шлях Моладзі“ № 3 — месячны часапіс беларускае моладзі; беларускі „Flirt dla ŭsich“.

— „Praleski„ № 3 — месячны часапіс для беларускіх дзетак. Цікавы і танны. Каштуе на год 1 зл. на паўгода —50 гр. Адрас Рэдакц.: Вільня, Завальная 1—2.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ Ў ЛАТВІІ.

Агульны Сход Таварыства Беларускіх вучыцялёў у Латвіі. Т-ва Беларускіх Вучыцялёў у Латвіі зьяўляецца аднэй з мацнейшых беларускіх культурна-асьветных арганізацыяў, якая на безпартыйна-прафэсыянальным і асьветным грунце аб'еднывае каля сябе амаль увесь актыў беларускае сьведамае інтэлігенцыі. Увосені (8-га верасьня) сёлета споўніцца 10 год ад часу закладзінаў Т-ва.

Т-ва ня толькі рупіцца аб прафэсыянальных інтарэсах беларускага настаўніцтва, але вядзе шырокую культурна-асьветную працу, утрымоўваючы шэраг беларускіх прыватных школ у Рызе і на правінцыі, а таксама і гімназію ў Рызе. Сродкі на гэтую працу складаюцца: з штомесячных працэнтных адлічэньняў сяброў Т-ва са сваей пэнсіі, што часам даходзе да 10 прац. з акладу, дапамог ад Ураду Латвійскае Рэспублікі і ад меставых самаўрадаў, з якіх да апошняга году найбольш дапамагала Т-ву Рыская Меставая Управа.

Чарговы агульны сход сяброў Т-ва адбыўся ў Рызе 6 студня ў памешчаньні Беларускага Пазычкова-Ашчаднага Т-ва. Сход заслухаў справаздачу Праўленьня Т-ва аб працы за 1934 год, зацьвердзіў буджэт на 1935 год, выразіў падзяку скарбніку Т-ва грам. К. Езавітаву за ягоную энэргічную працу і выбраў новае праўленьне і рэвізыйную камісію Т-ва. У праўленьне ўвайшлі: С. Сахараў, К. Езавітаў, Г. Плыгаўка, Ф. Клагіш і К. Мяжэцкі. У рэвізыйную камісію выбраны — Я. Кудраўцаў, Л. Тэтар і Я. Камаржынскі.

Бюджэты Т-ва даволі значныя. Так за 1933 год Т-ва мела справаздачны балянс у суме 22688,71 латаў, за 1934 год балянс крыху меншы — 18548,97 латаў, а новы бюджэт на 1935 год прадугледжаны ў суме 19700 латаў.

У зьвязку з 10-ці годзьдзем Т-ва, пастаноўлена выдаць брашуру аб працы Т-ва.

Т-ва мае два аддзелы: у Дзьвінску і ў Люцыне. Аддзелы ў сваей працы аўтаномны.

Вучыцель.

Pieramieny ŭ Polščy.

Nowaja konstytucyja.

U nočy z 23 na 24 sakawika polski Sojm akančalna pryniaŭ prajekt nowaj konstytucyi.

Nowaja konstytucyja zakraplaje pałažeńnie ŭ Polščy, jakoje paŭstała z pryčyny h. zw. majowaha pierawarotu 1926 h.

Nowaja konstytucyja apiraje nutrany ład Polskaj dziaržawy na inšych padstawach.

Pawodle nowaj konstytucyi, usia ŭłada znachodzicca ŭ rukach prezydenta dziaržawy. Prezydent adkazwaje tolki prad Boham i historyjaj.

Prezydenta wybiraje sabrańnie elektaraŭ, jakoje składajecca z 75 asob—wybranych Sojmam i Senatam, a takža z pradstaŭnikoŭ najwyšejšych dziaržaŭnych dastojnikaŭ. Ustupajučy prezydent moža padać kandydata na swajo miesca, a kali nie padaść, tady kandydata wyznačaje sabrańnie elektaraŭ. Prezydent moža na kandydata sabrańnia elektaraŭ nie zhadzicca i tady maje prawa zahadać wybary ahulnym hałasawańniem.

Prezydent maje prawa raspuščać Sojm i Senat i zahadywać nowyja wybary; naznačaje ŭrad; naznačaje treciuju čaść senataraŭ; moža strymać siłu kožnaha zakonu wydanaha Sojmam.

U sprawie wybaraŭ Sojmu i Senatu, u nowaj konstytucyi, niama pryncypu proporcyjanalnaści. U sprawie wybaraŭ budzie wydana specyjalnaja wybarnaja ordynacyja.

Nowaja konstytucyja amal nia maje ničoha ŭ sabie z sučasnaj konstytucyi z 1921 h.

Z konstytucyi ciapierašniaj — z 17 sakawika 1921 h. — nowaja konstytucyja pakidaje ŭ sile art. 99, 109—118, 120.

Z hetych — artyk. 109 i 110 zazabiaśpiačajuć prawy nacyjanalnym mienšaściam swabodnaha razwićcia ichnich narodnych asabliwaściaŭ, a takža zakładać swaje hramadzkija arhanizacyi.

Ab prawoch nacyjanalnych mienšaściaŭ hawora i art. 7 nowaj konstytucyi, pawodle jakoha ani pachodžańnie, ani relihija, ani nacyjanalnaść nia mohuć być pryčynaj ahraničeńnia prawoŭ.

Nowaja konstytucyja pryniata ŭ Sojmie 260 hałasami BB i inšych hrupak pasłoŭ praciŭ 139 hałasoŭ apazycyi. Pasły nacyjanalnych mienšaściaŭ ad hałasawańnia ŭstrymalisia. Pasoł Jaremič tak-ža ŭstrymaŭsia.

Polskija hazety — „Kurjer Lwowski“ — pišuć, što Ukraincy ŭstrymalisia za pryabiacanyja ŭstupki ŭ wybarnaj sprawie.

Rearhanizacyja Uradu i zakryćcio sesii Sojmu i Senatu.

Paśla pryniaćcia Sojmam prajektu nowaj konstytucyi i inšych spraŭ, dekretam Prezydenta 28 sakawika budžetnaja sesija Sojmu i Senatu zakryta.

Adnačasna z hetym adbyłasia rearhanizacyja ŭradu — premjer Kazłoŭski z celym Uradam padaŭsia ŭ adstaŭku, a staršynia Klubu BB pałk. Sławek, z daručeńnia Prezydenta, zarhanizawaŭ nowy urad, jaki składajecca z ministraŭ papiaredniaha Uradu. Na čale nowaha ŭradu staić pałk. Sławek.

Što budzie dalej?

Nowaja Konstytucyja jašče nie abawiazywaje. Hazety pišuć, što padhataŭlajecca prajekt wybarnaj ordynacyi, pawodle jakoj maje być Sojm z 250 pasłoŭ, a Senat z 90; wybarnuju ordynacyju maje pryniać Sojm, jaki budzie sklikany ŭ traŭni abo ŭ červieni miesiacy. Paśla abwieščańnia wybarnaj ordynacyi, Sojm i Senat majuć być raźwiazany i wyznačany nowyja wybary. Hazety dahadwajucca, što pawodle nowaj wybarnaj ordynacyi buduć wyznačany adnamandatowyja wybarnyja wokruhi, a kandydataŭ u pasły buduć wyznačać samaŭrady.

Napružańnie litoŭska-niamieckich adnosinaŭ.

Litwa, ad samaha pačatku swajho niezaležnaha dziaržaŭnaha bytu, staić na pieraškodzie niamieckim imknieńniam na ŭschod Eŭropy. Dziela hetaj ekspansii Niamieččynie nadta-ž patrebnaja litoŭskaja terytoryja z marskoj prystaniaj — Kłajpedaj. Niamieččyna roznymi sposabami starajecca Kłajpedu ad Litwy addzialić, kab pryłučyć jaje da siabie.

Kali ŭ Niamieččynie zapanawaŭ hitleryzm – jon pašyryŭsia i siarod kłajpedzkich niemcaŭ. Paŭstała ŭ Kłajpedzie arhanizacyja i pačała tajna dziejać suproć Litwy. Litoŭskija ŭłady heta prasačyli, padozranych aryštawali i addali pad sud. Sud razhladzieŭšy hetu sprawu padsudnych pryznaŭ winawatymi i zasudziŭ — 4-ch na karu śmierci, a druhich na doŭhahodnija kary wastrohu.

Suproć hetaha prysudu wa ŭsiej Niamieččynie pačalisia wuličnyja demonstracyi, a ŭ Litwie, asabliwa moładź, adkazwaje tak-ža demonstracyjami suproć pastupańnia niemcaŭ u adnosinach da Litwy.

Hetyja apošnija fakty wielmi mocna napružyli suadnosiny miž Litwoj i Niamieččynaj.

Litwa, z swajho abaronnaha stanowišča, Niamieččynie nia ŭstupaje, a Niamieččyna napaści na Litwu baicca, bo Litwa maje za saboj bałtycki blok dziaržaŭ, jaki znachodzicca pad upływam mižnarodnaj palityki Francyi i Anhlii.

Takim woś čynam małaja Litwa zručna abaraniajecca ad wialikich dziaržaŭ, jakija chacieli-b jaje prahłynuć.

Гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры!

Ці вы ўжо ўпарадкавалі свае бібліятэкі?

Увага! Дзеля таго, што ня можна рабіць паправак цэнаў у каталёгах кніжак, перасылаючы іх поштай, пастаноўлена цэны кніжак, прызначаных да прадажы падчас ТАННАГА МЕСЯЦА БЕЛАРУСКАЕ КНІЖКІ, абніжыць у наступны спосаб: усе кніжкі выдавецтва „Беларускае Крыніцы“, „Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры“, Т-ва „Пагоня“, „Каталіцкага Выдавецтва“, „Chryścijanskaj Dumki“ і Б. Клецкіна на 50 прац., а ўсе іншыя на 25 працэнтаў.

Беларуская Кнігарня „Пагоня“, Вільня, Завальная вул. №. 1.
Бел. кнігарня Ст. Станкевіча, Вільня, Вострабрамская №. 2.
Бел. кнігарня У. Манкевіча, Вільня, Вострабрамская № 1.

W. D—a.

25 sakawika u Pieraborach.

Na pryhožym, wysokim i krutym bierazie biełaruskaha Niomanu staić wioska Pierabory. U sakawiku kožny hod heta wioska nadta ažyŭlajecca, bo žychary jaje, ščyryja biełarusy, światkujuć 25-y sakawik. Jakraz tady siardzity Nioman uzdymajecca i, jak šalony, u mora pre kryhi. A tolki kryhi zojduć i wada na Niomanie pamienšaje, tady našy Pieraborcy na płytoch až u Prusy zajaždžajuć.

Na 25 sakawik źbiralisia ludzi ŭ chatu Wincusia Zadaronka. Usia wioska była naelektryzawanaja. Pad henaj chataj stajaŭ Michaś Łukašewič z dziaŭčynaj Kaciarynaj Chanionak. Jany čakali na światkawańnie.

— Kaciarynka, siahońnia praz cely dzień ja ciabie nia bačyŭ, što ty rabiła tak doŭha ŭ chacie? — pytaŭsia Michaś u dziaŭčyny.

— Ja z mamaj krosny zawodziła, — byŭ adkaz. Tyž wiedaješ, što ja tku ŭ wosiem nitoŭ ručniki.

— A ci mnie kali možna pabačyć twaje ručniki, Kaciarynka?—pytaŭsia Michaś.

— A čamuž nie! Tolki nie raniej, jak buduć jany na asielicy bialicca, žartaŭliwa adkazała dziaŭčyna.

Hutarka ich na hetym pierarwałasia. Na światkawańnie išoŭ stareńki Kanstantula. Jaho ŭ wioscy ŭsie nadta lubili. Zatoje, jak zhledzili na wulicy staroha, dyk usie da jaho žywa kinulisia. Najsprytniejšyja dwa chłapcy—Juljanowič z Januškiewičam chwacili pad ruki waśmidziesiacilетniaha starca i zawioŭšy jaho ŭ chatu Zadaronka niedaloka stała pasadzili jaho ŭ kresła. Na światа hetaje štoraz bolš ludziej źbirałasia. Wiasnawy marozik cisnuŭ dobra na wulicy bałota. Jašče pad płotam ležali staryja hurby śniehu. Časami łamałasia bałota pad nahami ludziej, tady ludzi stupali na sušejšaje miejsca, a padkoŭki ich ab kamieńni tak hromka stukali, što pa wioscy adbiwalisia dalokim recham. Uskočyła na hurbu śniehu śmiełnaja Razalka Siadziukiewič, ale adrazu ŭ śniech prawaliłasia i ŭ čarawiki sabie nabrała. Tut jana na ŭsiu moc zakryčała: chłopcy, ratujcie mianie! Pamahli jej chłopcy, i naša Razalka takža chutka apynułasia ŭ chacie Zadaronka.

Pa adnym, pa dwa i całymi hrupami schodzilisia ludzi ŭ chatu. Dobraja hramadka ščyrych biełarusaŭ pryšła i z čužych wiosak, bo Pieraborcy ich zaprasili na heta wialikaje biełaruskaje światа.

Toj wiečar nadta ščyra i doŭha Nioman hawaryŭ swaje wiačernija paciery... Na zawarocie ściralisia kryhi i z šeptam łamalisia... Na wulicy ŭ Pieraborach wyrazna byli čutny hetyja stohny biełaruskaj raki.

U chacie Wincusia Zadaronka pačałosia światkawańnie. Na kucie za stałom, siarod swaich kalehaŭ, bojkich chłapcoŭ Juljanowiča i Januškiewiča, byŭ Michaś Łukašewič. Na jaho ŭsia chata hladzieła. Jon byŭ dušoj hetaha światkawańnia. Ciapier jon ustaŭ i pačaŭ pramaŭlać da prysutnych.—Hramadzianie, užo siemnaccaty hod, jak my światkujem Niezaležnaść Biełarusi. Małodšaje pakaleńnie ŭzrasło ŭ hetych świetłych dumkach swajej niezaležnaści. My žywiom i zmahajemsia za hety ideał! — Ciša zalahła chatu. Prysutnyja hlytali kožnaje Michasiowa słowa. Na zedliku ŭ zapiečku cichańka siadzieŭ palicyjant. U jaho pad baradoj byŭ čorny remiančyk. Kali Michaś zakranaŭ dalikatniejšyja struny biełaruskaha žyćcia, tady wočy ludziej źwiartalisia na palicyjanta. Strojny rad dziaŭčat, a druhi chłapcoŭ razsielisia la ścien chaty. U sianioch nia stoŭpilisia mužčyny,—šmat ich pad woknami stajała. La parohu była kučka dziaciej padrostkaŭ. Ad duchaty ŭ chacie nie chacieła harэć lampa. Michaś pramaŭlaŭ dalej štoraz lepiej. Ciapier jon z pryciskam padčyrkiwaŭ: — Žywieć naš narod Biełaruski. Budujučy Biełaruś, my dobra wiedajem, što my robim i kudy my idziom! U chacie dalej było cicha, a Michaś usio raźwiwaŭ swaje dumki.

Raptam na wulicy niechta pa płocie kijom stukaŭ. Heta byŭ Mikita, syn Piatruli. U chacie tolki ličanyja asoby wiedali, ad kaho i z jakich pryčyn wychodziła hena nazojliwaje stukańnie. Mikita ŭ Pieraborach mieŭ swaje

Pierałomy ŭ eŭropejskaj palitycy.

Pieražywajem dni, u jakija rašajecca dalejšy los palityčnaha wyhladu Eŭropy — układajucca siły, na jakich trymajecca i ad jakich całkom zaležny ciapierašni palityčny eŭrapejski ład, — rašajecca los supakoju, zahrožanaha wajnoj, a tak-ža dola cełych dziaržaŭ i narodaŭ. Pieražywajem dni, sapraŭdy, histaryčnyja, — jdzie padhatoŭka da pastanowaŭ, katoryja mohuć pieratwaryć palityčny świet na inšy ład. Dziela hetaha palityčnyja kruhi ŭsiaho świetu za raźwićciom hetych padziejaŭ uważna hladziać i i adpawiedna adnosiacca z metaj abarony, pradusim, intaresaŭ swajej krainy.

Abiazsileńnie Wersalskaha traktatu.

Centralnaj wosiaj paślawajennaha palityčnaha ładu ŭ Eŭropie dasiul byŭ Wersalski traktat. Apošnimi časami Niamieččyna jaho zusim abiazsiliła, i prociŭ hetaha Francyja i Anhlija, a tak-ža i Italija śpiarša pačali pratestawać, ale, jak niamiecki ŭrad na hetyja pratesty machnuŭ rukoj, — pačali šukać inšych sposabaŭ dziela ŭspakajeńnia Niamieččyny.

Anhlija starajecca zaciahnuć pawarotna Niamieččynu ŭ Lihu Narodaŭ, kab tam zabawiazać jaje da pašany choć astatkaŭ Wersalskaha traktatu, a Francyja damahajecca nawat sudu ŭ Lizie nad Niamieččynaj za jaje niepasłuchmianaść.

Heta adnak, pakulšto, ani Francyi ani Anhlii nie ŭdajecca, a Niamieččyna ŭwarużajecca, machnuŭšy rukoj na Wersalki traktat.

Anhlija pa staranie francuska-sawieckaha sajuzu.

Miž Francyjaj i Sawietami, suproć palityčnych imknieńniaŭ Niamieččy z sajuźnikami, užo daŭno isnuje supolny front. Apošnimi dniami hety front padmacawaŭsia pajezdkaj anhielskich dyplomataŭ praz Berlin u Maskwu i adtul pawarotam praz Waršawu.

U Berlinie anhielskija dyplomaty hawaryli z Hitleram i wyjawiłasia, što adnosiny Niamieččyny da Sawietaŭ wielmi wajaŭničyja. — Hitler skazaŭ, što Rasieja zdaŭnych jošć woraham Zachodniaj Eŭropy i eŭrapejskaj cywilizacyi. Ab inšych sprawach, jakija datyčać supakoju i niamieckaj palityki, — Hitler wykazaŭ mahčymaść dyplomatyčnaha ich wyrašeńnia.

U Maskwie anhielski dyplomat — min. Eden byŭ pryniaty sawieckimi kamisarami nadta-ž pryjazna i haścinna. Byŭ pir haroj — ustrojeny ŭ česć Anhlii. Na bankiecie kamisar Litwinaŭ piŭ čaru ŭ česć anhielskaha karala. Min. Eden hawaryŭ ab mižnarodnaj palitycy i z Stalinam, katory pakazwaŭ na niebiaśpieku supakoju z boku Niamieččyny i Japonii, i dziwiŭsia, što ad Anhlii zaležny ciapier supakoj. Wizyta min. Edena ŭ Waršawie palityčnaha razhałosu nia maje.

Ahułam, hetyja haściny, pir i hutarki pakazwajuć, što Anhlija stanowicca pa staranie francuska-sawieckaha sajuzu, jaki wyrazna staić suproć palityčnych imknieńniaŭ Niamieččyny z swaimi sajuźnikami.

Mižnarodnaja— paneŭrapejskaja konferencyja.

U źwiazku z stwaryŭšymsia pałažeńniem u Eŭropie, anhielski ŭrad padaje prajekt sklikać ahulna-eŭrapejskuju konferencyju dziaržaŭ, dziela wyrašeńnia i ŭnormawańnia hetaha pałažeńnia. Na hetaj konferencyi, kali jana źbiarecca, akančalna maje być skasawany Wersalki traktat i stworany nowyja padstawy palityčnaha ładu ŭ Eŭropie. Dahadywajucca, što hety plan jošć u źwiazku z niadaŭnimi dyplomatyčnymi pajezdkami anhielskich ministraŭ i hutarkami min. Sajmona z Hitleram.

Słowam, Eŭropa hatowicca da hieneralnaj pierabudowy swajho palityčnaha hmachu.

Roznyja wiestki.

Hoład u Haliččynie. Letaś u Haliččynie, asabliwa u Jaworskim pawiecie, byŭ wielmi słaby ŭradžaj. Z hetaj pryčyny ciapier tam pawažnaj stałasia pahroza hoładu. Ukrainskija arhanizacyi naładzili akcyju dapamohi hałodnym u Jaworščynie i prosiać achwiaraŭ dla hałodnych. U Jaworščynie ŭ bolšaści žywuć ukraincy. Achwiary možna pasyłać pa adrasu: Kamitet Dapamohi Haładajučym u Jaworowi.

Z HAZET.

— Z „Kurjera Waršaŭskaha" dawiedwajemsia:—U Polščy źmianšajecca razrodčaść nasielnictwa, zbolšywajecca śmiarotnaść dziaciej i z kožnym hodam bolš prychodzić u wojska fizyčna słabiejšy rekrucki matarjał. Heta dziela taho, što „Polšč drenna kormicca" — piša „K. W."

— Anhielskaja hazeta „Iwning Standart" piša: — sielanin u Sawietach, što zahnany ŭ kolektyŭ, — heta kataržnik, jaki addaje ŭsio, a dastaje amal ničoha.

—Amerykanskaja hazeta „Tajms" kaža: da ŭtrymańnia ciapier supakoju ŭ Eŭropie znachodzicca kluč u Niamieččynie i ŭ Polščy. Jany mohuć zabiaśpiečyć supakoj padpisańniem h. zw. „uschodniaha dahaworu" i datrymańniem hetaha dahaworu.

Z POLŠČY.

Druhaja ŭnutranaja pazyčka. Ministerstwa Skarbu abwieściła, što 1 traŭnia siol. budzie raspisana 3 prac. Premjowaja Inwestycyjnaja Pazyčka. Pazyčku płacić možna kuplajučy cennyja papiery najmienš na 100 zł.

Ziamielnyja nałohi: — Ministerstwa Skarbu dało zahad zyskiwać ziamielnyja nałohi — padatki ad drobnych ziemlarobaŭ, što majuć nižej 15 hektaraŭ ziamli. Hety padatak płaciać u dźwioch ratach—1 lutaha i 1 lipnia.

Amnestyja. — Haworać, što ŭ źwiazku z źmienaj konstytucyi budzie dana amnestyja dla palityčnych i kryminalnych wiaźniaŭ.

Biezraboćcie. — Wa ŭsiej Polščy biezrabotnych ciapier naličwajuć— 514 276 asob.

Ziemlatrasieńnie.— 26 min. m-ca ŭ Zakapanym i ŭ wakolicach adčuli padziamielnyja huki i ŭzdryhi ziamli. Ćwierdziać, što heta było ziemlatrasieńnie.

Z ZAHRANICY.

Hoład u Kitaju. — Z pryčyny zasuchi, što letaś zasušyła kitajščynu, ciapier tam haładaje 12 mil. ludziej.

Biezraboćcie. — U bolšych eŭrapejskich dziaržawach biezraboćcie pradstaŭlajecca hetak: — u Francyi— 479.000 biezrabotnych, u Anhlii — 2.295.000, u Niamieččynie—2.974.000. U paraŭnańni z 1934 h. sioleta ŭ Anhlii mienš biezrabotnych na 112.000 asob. U inšych dziaržawach jašče mienšy znak spadku biezraboćcia.

Francyja i Sawiety. Cikawaja družba Sawietaŭ z Francyjaj. — Ciapier u Paryžy idzie wialiki sud nad 21 špijonami, jakija wywiedywali ŭ Francyi dla Sawietaŭ, i adnačasna ministr zahraničnych spraŭ Lawal wybirajecca ŭ Maskwu da balšawikoŭ na hutarki ab miru i dalejšym francuska-sawieckim sajuzie.

Пісьмы з вёскі.

У беларускай школе папольску вучаць.

Габы, Пастаўскага пав. У нашай вёсцы, на дамаганьне сялян, у 1927-28 школьным годзе адчынена беларуская школа. Па закону — у гэтай школе павінны вучыць пабеларуску. Але гэтак па закону, а фактычна — гэта школа польская: вучаць папольску, а беларуская мова толькі як прадмет. Паўбяды было-б, каб беларускую мову добра навучалі, але і гэты „прадмет" навучаюць тыя вучыцялі, што навучыліся крыху гаварыць пабеларуску ад нашых сялян, — гэткія вучыцялі беларускай мовай самі ня добра гавораць, бо перакручваюць беларускія словы. Здаралася, што вучыцель ня мог зразумець беларускіх сказаў, пачуўшы ад вучняў. Адзін раз вучыцель беларускай мовы ня мог „раскумякаць" сказу —„луг быў голы, як бубён." Зразумела, што ад такіх вучыцялёў вучань беларускай мовы не навучыцца: яе ён ведае з дому толькі — умее гаварыць, але правільна напісаць пабеларуску ня ўмее. Пры гэтым, ня ўмеюць вучні гэтай школы чытаць гражданкі.

Вось, як вучаць у казённай школе пабеларуску.

Бацькі, навучайце чытаць і пісаць пабеларуску сваіх дзяцей дома: — купіце лемантар (можна выпісаць з беларускіх кнігарняў з Вільні) і навучыце сваіх дзяцей чытаць і пісаць пабеларуску; большым дзецям давайце чытаць беларускія кніжкі.

П. Л—н.

Światkawańnie aktu 25.III.

Šalciny, Brasłaŭskaha pawietu. Dzień Biełaruskaha Narodnaha Świata 25.III. b. h. Šalcinaŭski Hurtok BIHiK maniŭsia adznačyć światkawańniem z adpawiednym referatam, śpiewami i deklamacyjami wieršaŭ. Usio patrebnaje było pryhatawana i zahadzia była wysłana zajawa ŭ brasłaŭskaje Starastwa. Starastwa adnak publičnaha światkawańnia naładzić nie dazwoliła, matywujučy zabaronu tym, što pamieškańnie „nie odpowieda warunkom bezpieczeństwa" i h. d. Dziela hetaha światkawańnie zmahło adbycca tolki ŭ zamknutym kruhu siabroŭ Hurtka.

Warta adznačyć, što ŭ hetym-ža pamieškańni, pry tych samych „warunkach bezpieczeństwa", z dazwołu brasłaŭskaha Starastwa naš Hurtok užo niekalki razoŭ ładziŭ publičnyja referaty.

Naddźwinski.

Вядзём працу саматугам!

Карэлічы, Наваградзкага пав. Цяжка жывецца на беларускай вёсцы. Душыць яе гаспадарчы крызыс, цiснуць падаткі і шарваркі. А цёмныя сілы з падзямельля стараюцца вырваць з нашага народу ягоную беларускую душу.

Няма беларускіх школаў, няма й магчымасьці да таго, каб вясьці беларускую нацыянальную і культурную працу праз беларускія арганізацыі; няма магчымасьці адчыніць якую беларускую культурную альбо гаспадарчую пляцоўку.

Гэта усё, аднак, ня сьведчыць, што праца беларуская ў нас замёрла.

Жыцьцё бярэ верх над усім і праца йдзе неафіцыяльна—гэта знача хатнім способам. Абыходзімся неяк без арганізацыяў,—чытаем беларускія газэты і кніжкі, вучым дзяцей чытаць пабеларуску і пачынаем заўважаць, што гэтакі способ выклікае большае зацікаўленьне з боку беларусаў. Дзякуючы нацыянальнай працы, народ пачаў адварачвацца ад камуністаў, асабліва пасьля таго, што сталася ў Саветах з грамадаўцамі і змаганцамі.

Дык браты! Не падайма духам, што няма магчымасьці адчыняць гурткі Інст. Гасп. і Культ. або Т.Б.Ш.

Вядзём працу саматугам— хатнім способам! Трэба толькі на вёсцы таннай кніжкі і газэты і беларус будзе жыць і ўзмацняцца нацыянальна. Заклікаем іншыя раёны, каб адгукнуліся на наш заклік.

Л. М.

Dziela taho, što Biełaruski adryŭny kalendar užo razyjšoŭsia i ŭ Wilni jaho niama ani ŭ knibarniach ani ŭ prywatnych asob, prosim pryslać nam, u kaho jon jašče astaŭsia cełym i nienadarwanym. Za heta redakcyja „B. Krynicy" wiernie hrošy za kalendar i wyšle premiju, jakaja była rassyłana pry „B. Krynicy" na 1935 hod (3 knižki).

zadańni. Jon biełarusam na sabrańniach zaŭsiody naruhaŭsia.

Michaś užo kančaŭ swaju pramowu, naciskajučy na ważnaść siahońniašniaha światkawańnia. Jon zaachwočawaŭ biełarusaŭ, kab jany za Biełaruś hrudźmi stajali i lubili jaje ŭsiej dušoj. — Biełaruś, rodnaja naša ziamielka, —kazaŭ jon—na jej my pieršy raz ubačyli świet Božy, jana nam daje žyćcio, jana i pa śmierci našaj u swajo nutro prymie kostački našy. Cywilizawanyja narody stajać mocna za swaju baćkaŭščynu, a ciž my biełarusy ad ludziej budziem horšymi!?...

Michać užo swajo skončyŭ. Niazwyčajnaha ažyŭleńnia i radaści była poŭnaja chata. Ludzi kryčali: — Brawa, brawa — Michaś Łukašewič! —

Dalej maładzież pačała swaje pieśni. Kaciaryna Chanionak była tut pačynalnicaj. Usia chata pawažna śpiawała hymn „Boža, što kališ narody na asobki padzialiŭ..." i „Ad wieku my spali"... Paśla hetych pačali pieśniu: „Hej ty, Nioman, raka..." Apošniuju zwarotku usie śpiawali praciažna i cicha:—„I z balučych hrudziej, Biełarusi dziaciej, Nad Taboj zahudzie pieśnia wolnych ludziej."

Na kucie strojna i enerhična stajaŭ Michaś. Jaho sinija wočy tak i biehali pa chacie, wietła spatykajučysia z usimi prysutnymi. Rusyja i kudrawyja jaho wałasy prydawali charastwa Michasiu. Jon u wioscy padabaŭsia każdamu i swaim wyhladam i taktykaj žyćcia. Ale ŭsie pawiarchoŭnyja prykmiety Michasiowy kasawalisia jahonym silnym charaktaram. Michaś— heta byŭ raźbitny biełaruski chłapiec. Jon byŭ usiestaronna duchowa wyrableny, z silnaj, jak stal, wolaj, z haračaj dušoj, z hłybokaj razwahaj. Michaś Łukašewič — heta nia z tych biełaruskich chłapcoŭ, što žywuć wietram padšytyja. Dla Michasia fundamantam žyćcia była žywaja wiera ŭ Boha i čystaja nawuka Chrysta. Usie parywy Michasiowaj dušy, jahonyja maładyja sny, rajeńni, plany — usio apirałasia na relihijnym zakonie. Kali jaho pytalisia kalehi, čamu jon taki ćwiordy ŭ charaktary, čamu jon idzieć na pierakor z nižejšymi swaimi chacieńniami, —Michaś im adkazywaŭ, što ad rožnych chacieńniaŭ jošć ustrymańnie i ciarpieńnie.

Choć Michaś byŭ prostym chłapcom, ale z hetakim charaktaram jon biazwiedna pakaraŭ dušy bližejšych da siabie wiaskoŭcaŭ. Hdzie byŭ Michaś, — tudy achwotna źbiralisia ludzi. Zaŭsiody na Michasia hladzieli ludzi miła, słuchali jaho radaŭ i ŭ pačynańniach jahonych jamu zaŭsiody spahadali i čym mahli, dyk pamahali.

Napiajaŭšysia ludzi biełaruskich pieśniaŭ, uznoŭ čakali, što Michaś skaža, a jon zaklikaŭ prysutnych: — Ludčyki, kali što ab našu Biełaruś chočycie zapytacca, dyk, kali łaska, pytajciesia.—Tut Andrej Ciaśluk padniaŭsia z miejsca: — A jak heta naša Biełaruś šyrokaja, ci mnoha ŭ nas palitykaŭ i wučonych? — Na heta Michaś adkazaŭ jamu prosta: „Prastoram zajmaje Biełaruś 30 miljonaŭ dziesiancin ziamli, abo ŭsiaho 300.000 kwadratnych kilometraŭ. A biełaruskija palityki i wučonyja ŭwialikim liku pracujuć u nadta drennych abstawinach.

Jašče z adnym pytańniem uzniałasia Ščureŭskaja Julka, najbajčejšaja ŭdawa ŭ Pieraborach.

— A chto-ž hena byli tyja biełarusy, što ŭ Miensku abwiaščali niezaležnaść Biełaruskaha narodu? — pytała jana. A Michaś i tut adkazaŭ hładka. — Heta byli tam słaŭnyja syny našaha narodu: sialanie, rabotniki, wučonyja i prostyja ludzi. —

Raptam moładź ad piečy ruchnuła da stała. U chacie Zadaronka čuwać byli hazy. Pačali ŭsie kašlać. Wincuk Zadaronak šyroka adčyniŭ wakno. Maryla Zadarončycha, haspadynia chaty, skarej u kałyscy nakrywała dziecia. Prašło minut dziesiać, „niebiaśpieka" minuła. Sabrańnie ab hetym maŭčała. U hetym ruchu mnohija nie razumieli nat, što takoje zdaryłasia. A heta zmahalisia palityčnyja biełarusaŭ praciŭniki.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič